**УДК 392:273.2(476.5)**

# СТАРАВЕРЫ ПАЎДНЁВА-УСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І СУЧАСНЫ СТАН ДАСЛЕДАВАННЯЎ

***канд. гіст. навук, дац. У.Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разгледжана гістарыяграфія і сучасны стан даследаванняў па гісторыі і культуры стравераў Паўднёва-Усходняй Беларусі. Вылучаны тры асноўныя этапы ў гістарыяграфіі пазначанай праблематыкі: сярэдзіна XVIII – пачатак XX ст.; 1920 – 1980-я гг.; 1990 – 2000-я гг. Дадзена характарыстыка метадам даследаванняў, раскрыта значэнне работ, вызначаны іх уклад у вывучэнне гісторыі і культуры старавераў рэгіёна. Прыходзім да высновы, што нягледзячы на даволі значны аб'ём праведзеных даследаванняў, да нашага часу не распрацаванымі застаўся шэраг важных пытанняў. Даволі фрагментарна даследаваны працэсы рассялення старавераў на тэрыторыі Паўднёва-Усходняй Беларусі, не прасочаны іх дэмаграфічныя працэсы ў XIX – пачатку XXI ст. Толькі павярхоўна вывучаны асаблівасці традыцыйнай культуры староверскага насельніцтва. Не даследаваны этнакультурныя працэсы ў старавераў рэгіёна ў XX – пачатку XXI ст.*

***Ключавыя словы:*** *гістарыяграфія, стараверы, этнічныя групы, Паўднёва-Усходняя Беларусь, гістарычная навука, этналогія і этнаграфія Беларусі, народная культура.*

**Уводзіны.** Тэрыторыя Паўднёва-Усходняй Беларусі з'яўляецца адным з важнейшых гістарычных цэнтраў стараверства ва Усходняй Еўропе. Стараверы апынуліся на гэтых землях у выніку расколу ў Рускай праваслаўнай царкве, які адбыўся ў сярэдзіне XVII ст. Значная частка насельніцтва, якая не прыняла царкоўную рэформу патрыярха Нікана, была вымушана эміграваць за межы Расіі. Адным з месцаў кампактнага пражывання перасяленцаў становяцца паўднёва-ўсходнія землі Беларусі. Першыя стараверы пасяляюцца тут яшчэ ў другой палове XVII ст., заснаваўшы мястэчка Ветку, якое ў наступным стала адным з важнейшых духоўных, эканамічных і мастацкіх цэнтраў усяго стараверства. За працяглы перыяд пражывання на беларускіх землях стараверы сфарміравалі ўнікальную культуру, папоўнілі скарбонку культурнай спадчыны беларусаў.

Мэта работы – прааналізаваць даследаванні, прысвечаныя гісторыі і культуры рускіх старавераў Паўднёва-Усходняй Беларусі. Артыкул з'яўляецца працягам публікацый аўтара па гістарыяграфіі стараверства на беларускіх землях (ужо была падрыхтавана праца па гісторыі вывучэння старавераў паўночнай Беларусі [1]).

У беларускай і замежнай гуманітарыстыцы прадпрымаліся спробы гістарыяграфічнага аналізу прац, прысвечаных староверам рэгіёна. У навуковай літаратуры па гэтым пытанні існуе некалькі публікацый. Так, характарыстыку асноўных крыніц па староверах Беларусі прадставіў А.А. Гарбацкі ў сваіх манаграфіях [2; 3] і спецыяльных даследаваннях «Вывучэнне гісторыі стараабрадніцтва на Беларусі» [4] і «Гісторыя стараабрадніцтва: вынікі крыніцазнаўчага вывучэння» (у 3 частках) [5]. Аналіз прац па гісторыі старавераў Веткі правяла расійская даследчыца В.М. Качэргіна ў асобным раздзеле манаграфіі «Стародубье и Ветка в истории русского старообрядчества (1760 – 1920 гг.): демографическое развитие старообрядческих общин, предпринимательство, духовная жизнь, культура» (2011) [6]. Шэраг даследаванняў 1990 – 2000-х гг., прысвечаных староверам БССР у 1920-я гг., прааналізаваў К.А. Латышаў [7]. Спробу вылучэння этапаў і аналізу метадалогіі даследаванняў стараверства ў Беларусі і суседніх краінах прадпрыняў А.С. Цмыг [8]. Аднак артыкул аказаўся вельмі павярхоўным. У ім не прааналізавана значная колькасць даследаванняў па гісторыі і культуры старавераў Беларусі. А што датычыцца аналізу фальклорных і этнаграфічных даследаванняў старавераў Беларусі, то ў працы ён зусім сціплы: не разгледжана большасць этнаграфічных і фалькларыстычных даследаванняў па азначанай тэме. Такім чынам, у айчыннай і замежнай гуманітарыстыцы адсутнічае комплекснае і ўсебаковае даследаванне гістарыяграфіі стараверства на паўднёва-ўсходніх землях Беларусі. Дадзеная праца скіравана на выпраўленне гэтай сітуацыі.

**Асноўная частка.** У вывучэнні гісторыі і культуры старавераў Паўднёва-Усходняй Беларусі можна вылучыць тры этапы. Першы з іх ахоплівае перыяд з сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XX ст. Другі этап датычыцца савецкай гістарыяграфіі і займае прамежак 1920 – 1980-х гг. Трэці этап (1990 – 2000-я гг.) ахоплівае сучасную постсавецкую гістарыяграфію.

**Працы сярэдзіны XVIII – пачатку XX ст.** Цікавасць да гісторыі і культуры старавераў рэгіёна праявілася ўжо ў сярэдзіне XVIII ст. Адным з першых, хто звярнуўся да гэтай праблематыкі, быў староверскі гісторык і пісьменнік Іван Аляксееў. У сваёй працы «История о бегствующем священстве» (1755) ён разгледзеў раннюю гісторыю важнейшага цэнтра старавераў рэгіёна – мястэчка Веткі. Нягледзячы на палемічны характар, праца ўтрымлівае карысныя звесткі па ранняй гісторыі стараверства ў рэгіёне [9].

Ужо ў канцы XVIII ст. даследаванні стараверства ініцыяваліся і з боку праваслаўнай царквы. Да работ такога плану належыць кніга А.І. Жураўлёва (А. Іаанава) «Полное историческое известие о старообрядцах, их учении, делах и разгласиях, собранное из потаенных старообрядческих преданий, записок и писем» (1794). У 1795 г. праца была перавыдадзена ў 4 частках пад назвай «Полное историческое известие о древних стригольниках и новых раскольниках, так называемых старообрядцах, о их учении, делах и разгласиях, собранное из потаенных старообрядческих преданий, записок и писем» [10]. У трэцяй частцы кнігі ўтрымліваецца шмат інфармацыі па гісторыі старавераў Веткі ў XVIII ст. Аўтар таксама звярнуў увагу на асаблівасці веравучэння і культу веткаўскіх старавераў. У наступным кніга неаднаразова перавыдавалася.

У першай палове XIX ст. не было апублікавана спецыяльных даследаванняў аб старaверах вывучаемага рэгіёна. Толькі ў сярэдзіне стагоддзя быў выдадзены шэраг прац, дзе разглядаліся пытанні гісторыі і культуры старавераў паўднёва-заходняй Беларусі. Іх аўтарамі былі прадстаўнікі праваслаўнай царквы або органаў улады, таму падыходы да выкладання матэрыялаў былі даволі тэндэнцыйнымі і аднабокімі. Нягледзячы на гэта, шэраг прац усё ж змяшчае важныя звесткі па гісторыі і культуры старавераў рэгіёна. Так, у 1855 г. была апублікавана кніга М.В. Без-Карніловіча «Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся», прысвечаная Віцебскай і Магілёўскай губерням. У ёй разгледжаны прычыны з’яўлення старавераў на паўднёва-ўсходніх землях Беларусі, коратка раскрыта гісторыя Веткі і яе слабод. У працы таксама прадстаўлена сціслая этнаграфічная характарыстыка старавераў Магілёўскай і Віцебскай губерняў [11, с. 237–240]. Некаторая інфармацыя па гісторыі гэтай этнаканфесійнай групы ў Ветцы ў XVIII ст. утрымліваецца ў працы мітрапаліта Макарыя (Булгакава) «Истории русского раскола, известного под именем старообрядства» (1855). Аўтар апісвае гісторыю пасялення старавераў у рэгіёне і станаўлення тут важнейшага цэнтра папоўцаў, дае характарыстыку веравучэнню веткаўскіх старавераў [12, с. 294–306]. Праца ўтрымлівае мала новых даных аб старaверах рэгіёна, паколькі асноўнымі крыніцамі для напісання адпаведных частак сталі ўжо згаданыя працы І. Аляксеева і А.І. Жураўлёва (А. Іаанава). Старавераў Веткі закранаў таксама А.П. Шчапаў пры агульным разглядзе стараверства ў Расіі ў XVII – першай палове XVIII ст. у працы «Русский раскол старообрядчества, рассматриваемый в связи с внутренним состоянием русской церкви и гражданственности в XVII и первой половине XVIII» (1858) [13].

Важную ролю ў даследаванні старавераў рэгіёна адыгралі працы П.І. Мельнікава і А.Р. Вішнякова, якія былі апублікаваныя ў 1860-я гг. Гэтыя даследчыкі пэўны час займалі дзяржаўныя пасады, звязаныя з барацьбой з «расколам». А таму іх працы змяшчаюць шмат важных звестак. Так, у 1864 г. была апублікавана кніга П.І. Мельнікава «Исторические очерки поповщины» [14]. У ёй шмат увагі было прысвечана гісторыі старавераў Веткі і яе слабод. У працы прааналізавана царкоўная гісторыя, дадзена характарыстыка працэсам фарміравання царкоўнай іерархіі ў старавераў-папоўцаў Веткі. А ў 1865 г. у «Весніку Заходняй Расіі» быў надрукаваны артыкул А.Р. Вішнякова (пад псеўданімам А. Вескінскі) «Раскол в западно-русском крае» [15]. Нягледзячы на тое, што ў працы разглядаўся «раскол» ва ўсіх паўночна-заходніх губернях Расіі, былі ў ёй ахарактарызаваны і староверы Магілёўскай губерні. У артыкуле прыведзены статыстычныя даныя, згаданы найбольш важныя цэнтры стараверства ў рэгіёне, дадзена характарыстыка царкоўнай арганізацыі папоўцаў Магілёўскай губерні. Больш падрабязна аўтар спыніўся на вызначэнні ролі Веткі і Лаўрэнцьеўскага манастыра ў жыцці старавераў рэгіёна. Таксама ў працы апісаны іх некаторыя рэлігійныя традыцыі і асаблівасці правядзення сямейных абрадаў.

У 1880-я гг. было апублікавана некалькі абагульняючых прац, у якіх разглядалася гісторыя і культура старавераў Паўднёвага Усходу Беларусі. Так, шэраг гістарычных і этнаграфічных матэрыялаў утрымліваюцца ў III томе «Живописной России» (1882). Даследчык А.Г. Кіркор прадставіў агульную этнаграфічную характарыстыку старавераў Беларусі, у тым ліку і паўднёва-ўсходняй яе часткі [16, с. 284]. Асобна ён спыніўся на характарыстыцы стараверскага насельніцтва мястэчка Веткі. Навуковец раскрыў гісторыю яго заснавання, прывёў асобныя факты з гісторыі мястэчка ў XVIII ст. [16, с. 428].

Вялікі аб’ём даных па старaверах Паўднёва-Усходняй Беларусі быў апублікаваны ў абагульняючым выданні «Опыт описания Могилевской губернии…», надрукаваным пад рэдакцыяй А.С. Дэмбавецкага ў трох кнігах. У першай кнізе (1882) вельмі падрабязна разгледжана гісторыя і культура старавераў Магілёўскай губерні [17, с. 653–678]. Аўтарам апісання з’яўляецца І. Рубаноўскі. У працы вельмі падрабязна асвятляецца ранняя гісторыя старавераў, пачынаючы з перасялення на гэтыя землі і заснавання Веткі са слабодамі і бліжэйшымі населенымі пунктамі. Але прыведзена мала новых матэрыялаў, паколькі асноўныя звесткі для падрыхтоўкі гістарычнай часткі нарыса ўзяты з ужо згаданых прац А.І. Жураўлёва і Макарыя. Таксама ў працы прадстаўлена характарыстыка матэрыяльнай культуры старавераў (жылля, адзення, ежы), гаспадарчых заняткаў (земляробства, гандлю, рамёстваў і промыслаў), апісаны сямейныя абрады (вяселле, радзіны, пахаванне), рэлігійныя традыцыі і ўяўленні. Матэрыялы для апісання былі сабраныя непасрэдна І. Рубаноўскім у рэгіёне ў 1880 – 1881 гг. Даследчык таксама спыніўся на характарыстыцы стараверскіх сагласаў у рэгіёне, апісаў мерапрыемствы ўлад і праваслаўнай царквы па далучэнні старавераў да аднаверства. У працы коратка ахарактарызавана і спецыфіка іх узаемаадносін з мясцовым насельніцтвам.

Істотную ролю ў даследаванні стараверскага насельніцтва ў паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі адыграў М.І. Лілееў. Ён апублікаваў шэраг прац па гісторыі і культуры старавераў рэгіёна. Грунтоўным даследаваннем па гісторыі старавераў Веткі і ваколіц з’яўляецца праца «Из истории раскола на Ветке и в Стародубье XVII – XVIII вв.» (1895) [18]. На аснове апублікаваных прац і разнастайных крыніц аўтар падрабязна разглядзеў працэс узнікнення стараверскіх пасяленняў у рэгіёне, гісторыю старавераў Веткі, паказаў яе ролю і прааналізаваў сувязі з іншымі цэнтрамі старавераства. Даследчык звярнуў увагу на асаблівасці гаспадарчай і адукацыйнай дзейнасці веткаўскіх манастыроў і скітоў, ахарактарызаваў царкоўную арганізацыю папоўцаў. Ён таксама апублікаваў шэраг прац, прысвечаных крыніцам па гісторыі старавераў рэгіёна Веткі і Старадуб’я. Так, у 1880 г. была выдадзена кніга «Описание рукописей, хранящихся в библиотеке Черниговской духовной семинарии» [19], а ў 1893 г. – «Новые материалы для истории раскола на Ветке и в Стародубье XVII – XVIII вв.» [20].

У этнаграфічным даследаванні старавераў Паўднёва-Усходняй Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. істотнае месца належыць Е.Р. Раманаву. У гэты перыяд даследчык апублікаваў шэраг прац, дзе разглядзеў культурную спадчыну мясцовых старавераў. У выпусках «Беларускага зборніка» ён змясціў шэраг тэкстаў іх вуснай народнай творчасці, пераважна, духоўных вершаў. Так, у першым томе былі надрукаваны некалькі духоўных вершаў, запісаныя ў Магілёўскай губерні [21, с. 369–372]. У пятым выпуску «Беларускага зборніка» Е.Р. Раманаў таксама апублікаваў духоўныя вершы старавераў, выдзеліўшы іх у асобны раздзел [22, с. 438–443]. Шэраг духоўных вершаў ён апублікаваў і ў артыкуле «З стараверскай літаратуры» [23], якi быў надрукаваны ў «Магілёўскай старыне» (1901). У трэцім выпуску «Магілёўскай старыны», які выдаваўся пад рэдакцыяй Е.Р. Раманава, быў апублікаваны артыкул П. Гаручкі «Материалы для истории раскола старообрядчества в Могилевской губернии конца XVIII-го – и начала XIX столетий» [24]. Выкарыстаўшы значны аб’ём архіўных даных, аўтар прадставіў нарыс царкоўнага жыцця старавераў губерні ў гэты перыяд.

Значнай этнаграфічнай працай аб старaверах Веткі і ваколіц з’яўляецца даследаванне І.С. Абрамава «Старообрядцы на Ветке: (Этнографический очерк)» (1907) [25]. Як адзначаў сам даследчык, летам 1907 г. яму давялося некаторы час пражыць сярод старавераў у мястэчку Ветка. На аснове матэрыялаў, зафіксаваных у гэты час, і пабудавана праца. Яна складаецца з дзвюх частак. У першай разгледжана гісторыя старавераў у Ветцы і прыведзена апісанне іх побыту, абраднасці і гаспадаркі. Пачынае свой нарыс І.С. Абрамаў з разгляду гістарычных падзей старавераў у Ветцы, пераважна ў XVIII ст. Аўтар таксама прыводзіць апісанне мястэчка, спыняючыся на характарыстыцы стараверскіх сядзіб і інтэр’еры хат, характарызуе адзенне старавераў, іх гаспадарчую дзейнасць. У працы апісваюцца каляндарныя традыцыі, вясельная абраднасць, культаваю сфера, ахарактарызаваны мясцовыя гаворкі. Другую частку нарыса складаюць тэксты песень і духоўных вершаў старавераў Веткі.

На пачатку XX ст. быў апублікаваны шэраг абагульняючых гістарычна-этнаграфічных прац, у якіх разглядаліся гісторыя і культура старавераў рэгіёна. Так, у 1900 г. пабачыла свет кніга Л. Вінаградава «Гомель. Его прошлое и настоящее. 1142 – 1900». У асобным раздзеле («Перасяленне стараабрадцаў») аўтар раскрывае гісторыю пасялення і станаўлення стараверскай супольнасці ў Гомелі і ваколіцах у першай палове XVIII ст. [26, с. 24–25]. А ў кнізе «Россия. Полное географическое описание нашего Отечества» (1905) [27] разгледжана гісторыя старавераў Магілёўскай губерні і прыведзена агульная характарыстыка асаблівасцей іх культуры. Апісанне побыту і культуры гэтай этнаканфесійнай групы належыць М. Доўнар-Запольскаму і Д. Шэндэрыку. У працы прыведзена апісанне сядзіб, жылля, інтэр’ера стараверскай хаты, адзення і традыцый харчавання, пералічаны гаспадарчыя заняткі, ахарактарызаваны вясельныя традыцыі. Таксама вылучаны асаблівасці іх рассялення ў межах Магілёўскай губерні, ахарактарызавана гістарычнае мінулае Веткі і ваколіц у XVIII ст. Як вынікае з іх аналізу, усе матэрыялы, якія ў главе датычацца старавераў Магілёўскай губерні, прыведзены з ужо згаданага выдання «Опыт описания Могилевской губернии…» [17].

**Вывучэнне стараверскага насельніцтва рэгіёна ў 1920 – 1980-х гг.** У айчыннай гістарычнай навуцы 1920 – пачатку 1930-х гг. было апублікавана некалькі даследаванняў, прысвечаных старaверам Паўднёва-Усходняй Беларусі. У гэты перыяд на беларускіх землях значна актывізаваўся краязнаўчы рух. З 1925 г. пачынае выдавацца часопіс «Наш край», на старонках якога быў апублікаваны шэраг краязнаўча-этнаграфічных прац аб старaверах Паўднёва-Усходняй Беларусі. Так, у 1929 г. быў надрукаваны артыкул М.І. Саламыкіна «Дарожныя нататкі. Веткаўскі раён, Гомельшчына» [28]. У час падарожжа ў Ветку і ваколіцы аўтар пакінуў апісанне мясцовай стараверскай архітэктуры (дамы, храмы, гаспадарчыя пабудовы), ахарактарызаваў традыцыі напісання ікон (у тым ліку і тэхналагічныя аспекты працы). Артыкул змяшчае таксама кароткі экскурс у раннюю гісторыю Веткі. У наступным 1930 г. у гэтым часопісе быў апублікаваны артыкул Ю. Кармянскага «30 дзён на дынамічным перапісу. (Чачэрскі раён)» [29], дзе прыведзена кароткае апісанне старавераў в. Покаць Чачэрскага раёна: побыт, гаспадарка, асаблівасці мовы, спецыфіка ўзаемаадносін з мясцовым беларускім насельніцтвам.

У міжваенны перыяд да гісторыі старавераства на беларускіх землях звяруўся М.М. Нікольскі, які займаўся вывучэннем праблем рэлігіі і царквы. У 1931 г. была апублікавана яго кніга «Гісторыя рускай царквы» [30]. Разглядаючы агульную гісторыю стараверскай царквы, аўтар звярнуў увагу і на старавераў Веткі і яе ваколіц. У працы разгледжана ранняя гісторыя Веткі XVIII ст., прааналізаваны асаблівасці царкоўнай арганізацыі веткаўскіх папоўцаў. Праца не ўтрымлівае якіх-небудзь новых звестак і носіць абагульняючы характар. Акрамя таго, дамінаванне марксісцкай метадалогіі ў даследаванні не дазволіла М.М. Нікольскаму аб’ектыўна ахарактарызаваць стараверскую царкву на беларускіх землях.

У пасляваенны перыяд важным накірункам становіцца лінгвістычнае даследаванне. Істотнае значэнне ў вывучэнні лексікі стараверaў Паўднёва-Усходняй Беларусі займаюць працы А.Ф. Манаенкавай. Аб'ектам вывучэння даследчыцы сталі гаворкі рускіх стараверaў Веткаўскага і Добрушскага раёнаў Гомельскай вобласці. У 1974 г. ёй была абаронена доктарская дысертацыя «Язык Ветки» [31]. А.Ф. Манаенкава таксама падрыхтавала шэраг грунтоўных публікацый па гэтай праблематыцы: «Лексика русских говоров Белоруссии» (1973) [32], «Русско-белорусские языковые отношения (На материале русских говоров Ветки)» (1978) [33], «Словарь русских говоров Белоруссии: Ветковский и Добрушский районы Гомельской области» (1989) [34]. Пад навуковым кіраўніцтвам А.Ф. Манаенкавай была падрыхтавана кандыдацкая дысертацыя А.А. Акуленка «Белорусское воздействие на островные русские говоры (на материале наименований одежды в русских говорах Жлобинского района Гомельской области)» (Мінск, 1996) [35]. Асновай для працы сталі матэрыялы палявых даследаванняў, праведзеных у 1974–1985 гг. на тэрыторыі Жлобінскага раёна. Важнымі з'яўляюцца высновы даслечыцы аб уплыве беларускага асяроддзя на лексіку і матэрыяльную культуру стараверaў рэгіёна.

Актуальным накірункам у вывучэнні культурнай спадчыны стараверaў паўднёва-ўсходняй часткі Беларусі ў 1970 – 1980-я гг. сталі археаграфічныя даследаванні. Пад кіраўніцтвам І.В. Паздзеевай супрацоўнікамі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта быў праведзены шэраг археаграфічных экспедыцый у рэгіёне. З 1970 па 1981 гг. супрацоўнікамі МДУ ажыццяўляліся комплексныя экспедыцыі ў былыя Веткаўска-Старадубскія слабоды. Вынікамі археаграфічных пошукаў стала фарміраванне Веткаўска-Старадубскага тэрытарыяльнага кніжнага збору, які налічвае вялікі аб'ём помнікаў, а таксама матэрыялы, якія характарызуюць выяўленчае мастацтва, фальклор, асаблівасці гаворкі, музычную культуру мясцовага старaверскага насельніцтва [36, с. 170]. На аснове матэрыялаў, сабраных у ходзе гэтых экспедыцый, быў падрыхтаваны шэраг публікацый, прысвечаных кніжнай культуры, мастацтву, мове і народнай культуры стараверaў рэгіёна [37–45].

У міжваенны перыяд у беларускай этнаграфіі не было спецыяльных даследаванняў аб стараверах Паўднёва-Усходняй Беларусі. Толькі рэдкія публікацыі змяшчалі інфармацыю аб гэтай этнаканфесійнай групе. У канцы 1980-х гг. была выдадзена энцыклапедыя «Этнаграфія Беларусі» (1989), у якой шэраг матэрыялаў адносіцца да стараверaў Паўднёва-Усходняй Беларусі. Даследчык П.У. Церашковіч у артыкуле «Стараверы» [46] прывёў аб іх гістарычную даведку, прадставіў кароткую дэмаграічную характарыстыку, вылучыў некаторыя асаблівасці матэрыяльнай культуры. Характарыстыку традыцый разьбы па дрэве веткаўскіх майстроў знаходзім у асобным артыкуле Я.М. Сахуты «Веткаўская разьба» [47]. А ў артыкуле «Веткаўскі дзяржаўны музей народнай творчасці» (аўтар – Г.Р. Нячаева) даецца апісанне калекцый музея, які змяшчае шмат экспанатаў матэрыяльнай культуры мясцовых стараверaў [48].

**Гістарыяграфія аб стараверах у 1990 – 2000-х гг.** З 1990-х гадоў у беларускай гуманітарыстыцы пачынаецца новы этап. У гэты перыяд значна ўзрастае цікавасць да гістарычнай і культурнай спадчыны этнічных груп, якія насяляюць Беларусь. У 1990–2000-я гг. значна актывізаваліся даследаванні, прысвечаныя стараверам. Ужо ў пачатку 1990-х гг. было апублікавана першае манаграфічнае даследаванне па гэтай праблематыцы – праца Т.П. Кароткай, К.С. Пракошынай і Г.А. Чуднікавай «Старообрядчество в Беларуси» (1992) [49]. Манаграфія стала вынікам палявых даследаванняў аўтараў, праведзеных яшчэ ў 1984–1987 гг. Праца не прэтэндуе на паўнату і вычарпальнасць. У ёй пераважна разглядаюцца змены, якія адбыліся ў рэлігійным жыцці стараверaў Беларусі ў 1950 – 1980-х гг., а таксама характарызуецца стан старaверскіх абшчын на канец 1980-х гг. У кнізе таксама сцісла разгледжана гісторыя стараверaў Веткі і яе акругі.

У 1995 г. у часопісе «Беларуская мінуўшчына» быў надрукаваны навукова-папулярны артыкул Х. Бейлькіна «Веткаўскія раскольнікі» [50]. У ім разгледжаны асноўныя гістарычныя падзеі з жыцця стараверaў Веткі, ахарактарызаваны асаблівасці іх мастацтва і кнігапісання.

Шэраг звестак і матэрыялаў аб стараверах Паўднёва-Усходняй Беларусі змяшчае калектыўная манаграфія «Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.)», апублікаваная ў 1998 г. [51]. Даследаванні старaверскай супольнасці на беларускіх землях ў гэты перыяд прадставілі А.М. Філатава і В.В. Грыгор'ева. Прававое становішча стараверaў Паўднёва-Усходняй Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. ахарактарызавала А.М. Філатава. В.В. Грыгор'ева разгледзела асаблівасці іх рассялення ў рэгіёне ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

Найбольш важным даследаваннем канца 1990-х гг. па гісторыі стараверaў на беларускіх землях стала манаграфія А.А. Гарбацкага «Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст.» (1999) [2]. Асновай для працы стаў шырокі комплекс апублікаваных і архіўных крыніц. У манаграфіі вылучаны рэгіёны кампактнага пражывання стараверaў у Паўднёва-Усходняй Беларусі, ахарактарызаваны гістарычныя падзеі ў канцы XVII – XVIII стст. (у першую чаргу, Веткі і ваколіц), прааналізавана іх прававое становішча ў XIX – пачатку XX ст. У працы таксама прыведзены звесткі аб эканамічным становішчы стараверaў рэгіёна ў XIX – пачатку XX ст., змешчаны дэмаграфічныя і статыстычныя даныя. Даследчык таксама ахарактарызаваў гаспадарчую дзейнасць стараверaў рэгіёна, апісаў некаторыя асаблівасці народнага дойлідства (культавых пабудоў, жылля, гаспадарчых пабудоў), адзення, вясельнай абраднасці. Пры характарыстыцы

традыцыйнага вяселля А.А. Гарбацкі выкарыстаў сабраныя ім палявыя фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, зафіксаваныя на Гомельшчыне. Іншая манаграфія даследчыка «Стараабрадніцтва на беларускіх землях» (2004) [3] амаль не адрозніваецца ад папярэдняй і фактычна з'яўляецца яе перакладам на рускую мову.

Важнай вехай у вывучэнні старавераў Беларусі стала правядзенне канферэнцыі «Стараабрадніцтва як гісторыка-культурны феномен» (г. Гомель, 2003 г.). Вялікі аб'ём даследаванняў, прадстаўленых удзельнікамі, быў прысвечаны пытанням гісторыі і культуры гэтай этнаканфесійнай супольнасці на тэрыторыі Паўднёва-Усходняй Беларусі. Так, Г.А. Аляксейчанка разгледзеў гістарыяграфію аб старaверах у навуковай спадчыне Е.Р. Раманава [52, с. 13–17]. Прававое становішча старавераў Магілёўскай губерні ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. атрымала асвятленне ў артыкуле Т.У. Апіок [52, с. 22–25]. Роля Н.П. Румянцава ў жыцці гомельскіх старавераў прасочана ў працах К.А. Біруковіч [52, с. 25–28], А.Л. Кіштымава [52, с. 111–118], Ю.А. Лабынцава і Л.Л. Шчавінскай [52, с. 142–147]. Гаспадарчая і культурная дзейнасць староверскіх манастыроў рэгіёна ахарактарызавана ў артыкулах Г.В. Кузьміч [52, с. 139–142], М.В. Качэргінай і А.М. Дубраўскага [52, с. 71–74, с. 131–136]. Даследчыца А.І. Зелянкова на аснове матэрыялаў апытання прадставіла характарыстыку староверскай супольнасці в. Крупец Добрушскага раёна [52, с. 85–87]. У даследаванні В.І. Коваля разгледжаны асаблівасці лексікі веткаўскіх старавераў [52, с. 122–125]. Пытанні ўзроўню адукацыі староверскага насельніцтва Веткаўшчыны ў канцы XIX – першай палове XX ст. разгледзела С.І. Лявонцьева [52, с. 150–156]. Помнікі мастацкай і пісьмовай культуры старавераў Веткаўшчыны даследаваны Л.М. Мазейка [52, с. 177–180], В.І. Галко [52, с. 43–47], Г.Р. Нячаевай [52, с. 203–211]. Унутрыпалітычную сітуацыю ў Рэчы Паспалітай у сувязі з «выгнанкай» старавераў з Веткі ў 1735 г. ахарактарызаваў А.У. Мацук [52, с. 184–187]. Асаблівасці вуснай народнай творчасці старавераў Усходняга Палесся вызначыла С.Я. Нікіціна [52, с. 215–222]. Пытанні староверскай архітэктурнай спадчыны ў Гомелі разгледзелі Т.Ф. Літвінава [52, с. 156–161], А.В. Скідан [52, с. 258–260]. У артыкуле С.А. Пасталоўскага прадстаўлена характарыстыка гэтай этнаканфесійнай групы на Гомельшчыне ў 1920 – 1930-я гг. [52, с. 233–235]. Асаблівасці ўзаемаадносін старавераў з савецкай уладай на Гомельшчыне ў 1920-я гг. вылучыў М.І. Старавойтаў [52, с. 260–263]. А.Р. Яшчанка дала кароткую характарыстыку гарадскому староверскаму насельніцтву Магілёўскай губерні ў другой палове XIX – пачатку XX ст. [52, с. 299–300].

У апошнія дзесяцігоддзі значна пашыраецца кола навуковых накірункаў у вывучэнні старaверства на беларускіх землях. Адным з іх стала даследаванне традыцыйнай культуры гэтай спецыфічнай этнаканфесійнай групы. Этнаграфічным вывучэннем старавераў усходняй Беларусі ў гэты перыяд займаецца Т.І. Хурсан. Шэраг яе прац былі прысвечаны характарыстыцы традыцыйнай культуры старавераў рэгіёна. Так, апісанне вясельнай, радзіннай і пахавальнай абраднасці на аснове матэрыялаў палявых даследаванняў прадстаўлена ў артыкулах «Асаблівасці сямейных традыцый стараабраднікаў Усходняй Беларусі» [53] і «Вясельны абрад стараабраднікаў Беларускага Падняпроўя» [54]. Рэлігійныя традыцыі старавераў Паўднёва-Усходняй Беларусі былі разгледжаны ў працах «Рэлігійная культура стараабраднікаў Усходняй Беларусі» [55] і «Рэлігійная дзейнасць стараабраднікаў Усходняй Беларусі ў XX стагоддзі» [56]. Асаблівасці матэрыяльнай культуры старавераў рэгіёна былі ахарактарызаваны ў артыкулах «Рассяленне і заняткі стараабраднікаў на тэрыторыі Усходняй Беларусі» [57] і «Асаблівасці традыцыйнай матэрыяльнай культуры стараабраднікаў Беларускага Падняпроўя» [58].

Даследчыцай Т.І. Хурсан у 2020 г. была апублікавана навукова-папулярная кніга «Стараабраднікі Беларусі: мінулае і сучаснасць» [59]. Выданне сваёй назвай хоць і датычыцца ўсіх старавераў Беларусі, але ў ім апісваюцца пераважна староверы паўднёва-ўсходняй яе часткі (і, перш за ўсё, Бабруйшчыны). Так, першая глава працы прысвечана разгляду асаблівасцей рассялення старавераў на Беларусі. Але ў ёй у асноўным прадстаўлены ўжо раней апублікаваныя іншымі аўтарамі даныя аб этапах засялення беларускіх земляў староверамі. Глава таксама змяшчае дэмаграфічныя звесткі аб іх колькасці ў другой палове XIX – пачатку XX ст. у адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам на той час. Прадстаўленыя даныя даволі адрывістыя і несістэмныя. Толькі дэмаграфічная характарыстыка прадстаўлена больш сістэмна. У другой главе прыводзяцца асобныя падзеі з гісторыі староверскай царквы на Беларусі ў XX – пачатку XXI ст. Аднак поўнай карціны аб яе гісторыі ў гэты перыяд выданне не змяшчае. Наступная глава прысвечана разгляду культурных традыцый старавераў. Асноўны змест яе складаюць матэрыялы з ужо згаданых вышэй артыкулаў даследчыцы і датычацца амаль выключна старавераў Паўднёва-Усходняй Беларусі.

Да пытанняў традыцыйнай культуры старавераў звярталася Г.І. Каспяровіч. У асобным раздзеле навукова-папулярнай кнігі «Кто живет в Беларуси» (2012) [60] даследчыца ахарактарызавала асаблівасці рассялення, матэрыяльнай культуры (гаспадарчыя заняткі, планіроўка паселішчаў, народная кулінарыя, традыцыйнае адзенне) і сямейнай абраднасці старавераў Паўднёва-Усходняй Беларусі. А ў іншай сваёй працы яна разгледзела асаблівасці іх гаспадарчай дзейнасці [61].

У 2000-я гг. павялічваецца колькасць мастацтвазнаўчых публікацый, прысвечаных староверам рэгіёна. Уплыў старавераў на беларускі народны тэкстыль прааналізаваны ў даследаваннях В.А. Лабачэўскай [62–63]. Вывучэннем мастацкай культуры веткаўскіх старавераў займаюцца С.І. Лявонцьева і Г.Р. Нячаева. Даследчыца С.І. Лявонцьева вывучае мастацкае афармленне рукапісных кніг старавераў [64–68, 70], а Г.Р. Нячаева даследуе іканапісную традыцыю веткаўскіх старавераў [69–70].

У гэты перыяд пашыраюцца і гістарычныя даследаванні стараверскай супольнасці. Вывучэннем гісторыі старавераў усходняй Беларусі ў 1920 – 1930-я гг. займаецца С.А. Пасталоўскі [71–73]. У яго працах характарызуецца стан стараверскага грамадства ў гэты перыяд, разглядаецца ўплыў на яе мерапрыемстваў савецкай улады. Вялікі аб'ём матэрыялаў, выкарыстаных у працах даследчыка, датычыцца старавераў Паўднёва-Усходняй Беларусі.

Вывучэннем этнічных груп Паўднёва-Усходняй Беларусі, у тым ліку і старавераў, займаюцца А.Д. Лебедзеў, В.П. Пічукоў, Р.М. Рагінскі, В.У. Друзянок. Вынікі іх даследаванняў увасобіліся ў шэрагу артыкулаў і зборнікаў матэрыялаў. Сярод накірункаў даследаванняў гомельскіх навукоўцаў важным з'яўляецца вывучэнне гісторыі стараверства рэгіёна ў савецкі перыяд. Пытанням узаемадзеяння старавераў з савецкай уладай прысвечаны шэраг прац А.Д. Лебедзева [74–76], В.У. Друзянок [76–77], Р.М. Рагінскага [78–80]. Важнае значэнне маюць выдадзеныя гомельскімі даследчыкамі зборнікі архіўных матэрыялаў па гісторыі стараверства ў рэгіёне. Першы зборнік «Конфессии на Гомельщине (20–30-е годы XX в.)» быў апублікаваны ў 2013 г. Ён змяшчае і матэрыялы па старaверах [81, с. 285–307]. Ва ўступнай главе, аўтарамі якой з'яўляюцца А.Д. Лебедзеў і В.П. Пічукоў, змешчана гістарычная даведка аб старaверах Гомельшчыны [81, с. 31–35]. Наступнае выданне было цалкам прысвечана стараверскаму насельніцтву рэгіёна. У 2017 г. быў апублікаваны зборнік дакументаў і матэрыялаў «Старообрядцы на Гомельщине (1918–1991 гг.)» [82]. Выданне ўтрымлівае 212 дакументаў, галоўным чынам з фондаў Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці. Зборнік з'яўляецца каштоўнай крыніцай для даследавання гісторыі, сацыяльна-эканамічных і дэмаграфічных працэсаў, культурных традыцый старавераў Гомельшчыны. Выданне суправаджаецца ўступным артыкулам (аўтары – А.Д. Лебедзеў і В.П. Пічукоў), у якім разглядаецца прававое становішча гэтай этнаканфесійнай групы ў XX ст. [82, с. 6–18].

